УДК 069.01(1-21)

# ПОШУК І ТРАНСФАРМАЦЫЯ ДЭФІНІЦЫІ “МУЗЕЙ ГОРАДА”

**Кавалёва Ю.В.**
*Дзяржаўная ўстанова “Музей гісторыі горада Мінска”, Мінск*

*Артыкул прысвечаны аналізу навуковых даследаванняў, якія тычацца вызначэння паняцця “музей горада”. Разглядаецца гісторыя вывучэння гэтай з’явы ў музеязнаўстве з другой паловы XIX ст. да нашага часу. Вывучаюцца падыходы да афармлення музеяў гарадоў у асобную катэгорыю. Разглядаюцца матэрыялы міжнародных навуковых канферэнцый, прыводзяцца і аналізуюцца дадзеныя воркшопаў 2015 г. у Берліне і Маскве, дзе была зроблена першая спроба знайсці афіцыйнае адзінае вызначэнне дэфініцыі “музей горада”.*

*Прыводзяцца ключавыя словы, звязаныя з дзейнасцю сучасных музеяў гарадоў. Вылучаюцца профільныя групы і тыпалогія музеяў гарадоў у адпаведнасці з іх калекцыямі, месцарасполажэннем, падпарадкаваннем, гісторыяй. Ажыццяўляецца аналітычны агляд шасці выніковых вызначэнняў паняцця “музей горада”, якія былі сфармуляваны спецыялістамі з розных краін свету па выніках абмеркавання дадзеных апытання 2015 г. Вылучаюцца агульныя тэндэнцыі ў пошуку адзінага вызначэння дадзенай дэфініцыі. Разглядаецца роля музея ў сучаснай урбаністычнай прасторы, прыводзяцца прыклады інавацыйных праектаў, праз якія музей здольны пашырыць свае межы і сваю аўдыторыю.*

*Прыводзяцца магчымыя прычыны адсутнасці адзінага вызначэння дэфініцыі “музей горада”. Аналізуецца стан сучаснага музея як сацыяльнага інстытута ва ўмовах трансфармацыі грамадскіх працэсаў і іх уплыву на культурнае жыццё горада.*

***Ключавыя словы:*** *музей горада, гарадскі музей, гарадская прастора, тыпалогія гарадскіх музеяў, асаблівасці гарадскіх музеяў, гарадская ідэнтычнасць.*

*(Искусство и культура. – 2020. – № 3(39). – С. 47–53)*

# SEARCH AND TRANSFORMATION OF THE DEFINITION OF THE CITY MUSEUM

**Kovaleva Y.V.**
*State Institution “The City of Minsk History Museum”, Minsk*

*This article analyzes the research on the definition of the notion of the City Museum. It discusses the history of the study of this phenomenon in museology from the second half of the XIX century to our time. Approaches to the decoration of the city museums as a separate category are studied. Proceedings of international scientific conferences are considered and data of 2015 workshops in Berlin and Moscow are analyzed, where the first official attempt to find a single definition of the City Museum was made.*

*Key words that are related to contemporary city museums are given. Profile groups and typology of city museums in accordance with their collections, location, subjugation and history are distinguished. An analytical review of the final six definitions of the City Museum, which were formulated by experts in the field from around the world at the end of the discussion to the 2015 survey, is carried out. There are some common trends in the search for a single definition. The role of the museum in contemporary urban space is examined; examples of innovative projects through which the museum is able to expand its borders and its audience are presented.*

*The possible reasons for the lack of a single definition of the City Museum are given. Examines The state of the contemporary museum as a social institution in the transformation of social processes and their influence on the cultural life of the modern city are analyzed.*

***Key words:*** *City Museum, museum of the city, cityscape, the typology of the city’s museums, features city museums, urban identity.*

*(Art and Cultur. – 2020. – № 3(39). – P. 47–53)*

Навуковыя пошукі вызначэння паняцця “музей горада” адносяцца да часоў узнікнення такіх музеяў у другой палове XIX – пачатку XX ст. Адной з першых спроб тэарэтычнага абгрунтавання сутнасці музея горада з’яўляецца праца супрацоўніка музея Нью-Ёрка Джона Ван Пелта (John Van Pelt). У кнізе “Горад – наш галоўны артэфакт” змешчаны артыкул пра гісторыю станаўлення музеяў гарадоў, дзе прыводзяцца ўрыўкі з прац

*Адрас для карэспандэнцыі: kovaliovayuliya@gmail.com – Ю.В. Кавалёва*



Репозиторий ВГУ

Дж. Ван Пелта, якія былі апублікаваныя ў 1931 г. у часопісе “The Museum News” Амерыканскай асацыяцыі музеяў [1].

У савецкім музеязнаўстве групу гарадскіх музеяў як асобную катэгорыю мясцовых музеяў упершыню вылучыў Е.В. Рудакоў. Адметныя рысы музеяў гарадоў сфармуляваў Л.А. Ільін. Ён дае некалькі вызначэнняў паняцця “гарадскі музей”. Аўтар падкрэслівае, што часам пад музеем горада разумеліся мастацкія галерэі з твораў сусветнага мастацтва, часам – зборы твораў мясцовага мастацтва, археалогіі, гісторыі і іншых прадметаў, якія звязаны з культурай рэгіёна. Такім чынам, у 1920-я гг. гэты тэрмін абазначаў даволі розныя паняцці, прычым вызначэнне “гарадскі” ў першым прыкладзе ўказвала толькі на ведамасную прыналежнасць музея, у другім – на яго змест. Таксама пад такімі музеямі меліся на ўвазе і самі зборы падобнага роду прадметаў, якія адносіліся да пэўнага горада [2, с. 5–7].

У СССР музеі гісторыі гарадоў не разглядаліся як штосьці адасобленае ад гістарычных музеяў. Адзіная крыніца, якая сведчыць пра цікавасць да дадзенай групы музеяў, гэта артыкул У.П. Нікаленкі “Музей гісторыі сталіцы”. Але ён не ахоплівае ўсяго комплексу такіх устаноў, а разглядае толькі сталічныя і ігнаруе ўсе астатнія.

Новы этап у вывучэнні сутнасці музея горада пачаўся з выдання ў 1995 г. нумара часопіса “Музеум”, цалкам прысвечанага музеям гісторыі гарадоў. Сучасныя даследаванні музеяў гісторыі гарадоў актывізаваліся з узнікненнем прафесійных асацыяцый міжнароднага ўзроўню, такіх як Міжнародная асацыяцыя музеяў гарадоў, створаная ў Барселоне ў 1995 г., CAMOC (Камітэт па калекцыях і дзейнасці музеяў гарадоў), створаны ў структуры ICOM у 2005 г.

Мэта артыкула – правесці аналіз існуючых дэфініцый “музей горада” праз прызму гістарычнай трансфармацыі музея гісторыі горада і яго культуралагічнага зместу.

**Даследаванні і асэнсаванне асаблівасцей групы музеяў гарадоў.** Адной з галоўных крыніц па вывучэнні феномена музея горада і гісторыі яго станаўлення з’яўляецца спецыяльны нумар часопіса “Музеум”, дзе сабраны артыкулы спецыялістаў дадзенай галіны і супрацоўнікаў музеяў гарадоў з усяго свету. Не кожны аўтар засяроджвае ўвагу на сутнасці паняцця “музей горада”, аднак у кожнага прасочваецца свой падыход да адлюстравання гарадской гісторыі ў музеі.

Аўтар уступнага артыкула Нікола Джонсан (Nichola Jonson) сярод прычын узнікнення музеяў гарадоў называе ўрбанізацыю і рост гарадоў, дзе музеі сталі спробай захавання мінулага. Яна параўноўвае старыя і новыя музеі гарадоў і разважае пра іх шырокія магчымасці. Н. Джонсан адзначае, што горад павінен заставацца галоўным аб’ектам цікавасці для дадзенай групы музеяў. Калі ж гэты фокус змяшчаецца, музей ператвараецца ў культурны цэнтр [3].

Макс Хебдзіч (Max Hebditch) звяртае ўвагу на нязначную колькасць музеяў гарадоў пры высокім узроўні ўрбанізацыі ў свеце, выказвае занепакоенасць адсутнасцю да канца асэнсаванага прызначэння музея горада. Аўтар аналізуе сутнасць назвы “Музей Лондана” у процівагу назве “Музей гісторыі Лондана”, якая б абмяжоўвала яго змест і ігнаравала б сучаснасць і будучыню горада. М. Хебдзіч падкрэслівае важнасць самога паняцця “горад”, дзе назіраецца адсутнасць адзінства меркаванняў [4].

Амарэсвар Гала (Amareswar Galla) на прыкладзе ўласнага вопыту працы ў адным з мультыкультурных гарадоў свету Канберы прапануе паняцце “гарадская музеялогія” і вылучае задачы музея горада, у першую чаргу разумеючы яго як культурны цэнтр. На аснове вызначэння музея дадзенага ICOM, ён дае перафармуляванае вызначэнне музея горада. “Музей горада – гэта некамерцыйная, дынамічная, адкрытая для публікі ўстанова або культурны механізм, які дзейнічае ў інтарэсах гарадскога насельніцтва і яго развіцця, каардынуе, набывае, захоўвае, вывучае, інтэрпрэтуе і экспануе ў мэтах вывучэння, асветы, прымірэння супольнасцяў і атрымання імі задавальнення матэрыяльныя і нематэрыяльныя, рухомыя і нерухомыя прадметы, якія складаюць спадчыну, сведчанні, што адносяцца да розных народаў і іх акружэння” [5].

Аналіз артыкулаў часопіса “Музеум” паказвае адсутнасць у аўтараў адзінства ў падыходзе да вызначэння паняцця “музей горада” або нават абыходжанне гэтага пытання і пераносу акцэнтаў на розныя віды музейнай дзейнасці.

**Аналіз матэрыялаў міжнародных навуковых канферэнцый, прысвечаных музеям гарадоў.** У першыя дзесяцігоддзі XXI ст. Міжнародная асацыяцыя гарадскіх музеяў і CAMOC арганізавалі шэраг навуковых канферэнцый, дзе разглядаліся самыя разнастайныя аспекты работы музеяў гісторыі гарадоў. Аналіз матэрыялаў канферэнцый дазваляе вылучыць некаторыя новыя падыходы да вызначэння паняцця “музей горада” ў XXI ст. Так, Рэне Кісцемэйкер

Рэпазіторый ВДУ

(Renée Kistemaker) ва ўступным артыкуле да матэрыялаў канферэнцыі ў Амстэрдаме ў 2005 г. "Гарадскія музеі як цэнтры грамадскага дыялогу" задаецца пытаннем аб сутнасці музея горада. На яе погляд, пануе меркаванне аб тым, што гэта музеі гістарычныя, і часта так і ёсць. Аднак зборы такіх музеяў могуць уключаць прадметы мастацтва, археалогіі і нават натуральнай гісторыі, таму тут патрэбна большая дакладнасць. У якасці ўзорнага аўтар прыводзіць даволі простае вызначэнне Сцівена Цілеманса (Steven Thielemans), дзе музей горада – гэта музей пра горад і ў горадзе. Тут ясна абазначаны аб'ект вывучэння музея – горад і яго месцараспалажэнне – горад, імя якога музей носіць. Р. Кісцемэйкер пераносіць акцэнт на ролю горада ў сучасным свеце, хуткія тэмпы ўрбанізацыі, міграцыйныя працэсы. Яна ставіць тры ключавыя пытанні перад сучасным грамадствам. Першае – "фарміраванне горада" – якія калекцыі і прадметы здольныя зафіксаваць сучасныя гарадскія працэсы. Другое – "актыўнасць у горадзе" – якім чынам музей можа быць уключаны ў гарадское жыццё, ці пазіцыяніруе сябе як пляцоўку для грамадскага дыялогу, ці з'яўляецца ён часткай горада або "варотамі ў горад". Трэцяе – "прэзентацыя горада" – якім чынам музей можа дэманстраваць свае калекцыі, каб адлюстраваць горад у экспазіцыі [6].

У кнізе "Горад – наш галоўны артэфакт", якая з'яўляецца калектыўнай манаграфіяй па выніках канферэнцыі CAMOC, закранаюцца розныя аспекты дзейнасці гарадскіх музеяў, у тым ліку і вызначэнне паняцця "музей горада". Так, Джон-Льюіс Пастула адзначае, што ў дадзеным пытанні патрэбна звяртаць увагу на дзве акалічнасці: 1. Адносіны паміж музеем і сучаснасцю ці нават будучыняй. 2. Важнасць перадачы гарадской супольнасці інфармацыі ў рамках таго дыскурсу, які фарміруе музей [1].

**Пошукі вызначэння паняцця "музей горада" на міжнародным узроўні.** Спроба сфармуліраваць вызначэнне дэфініцыі "музей горада" на міжнародным узроўні была распачата CAMOC у 2015 г. У Берліне і Маскве праводзіліся воркшопы для прафесіяналаў музейнай справы, дзе абмяркоўваліся мэты і задачы музея горада ў XXI стагоддзі. Напярэдадні воркшопа ўсім яго ўдзельнікам была разаслана анкета з мэтай наступнага аналізу адказаў і абмеркавання. У воркшопе прымалі ўдзел дзве падгрупы, у склад якіх уваходзілі: Суай Аксой (Suay Aksoy), ICOM International, старшыня кансультатыўнага камітэта; Афсін Алтайлі (Afsin Altayli), CAMOC news, Стамбул; Ларс Дэ Йегер (Lars De Jaegher), Генцкі гарадскі музей; Клаўдзія Джэммеке (Claudia Gemmeke), Дзяржаўны музей Берліна; Неле Гюнцерот (Nele Güntheroth), Дзяржаўны музей Берліна; Ханс Марцін Хінц, ICOM International, прэзідэнт; Отта Хахрэйтэр (Otto Hochreiter), Музей Граца; Рэне Кісцемэйкер (Renée Kistemaker), Амстэрдамскі музей; Кроўфард МакГуган (Crawford McGugan), Адкрыты музей, Жыццё Глазго / Музеі Глазго; Джоана Мантэйру (Joana Monteiro), Музей Лісабона і ICOM Партугалія; Марлен Мульў (Marlen Mouliou), старшыня CAMOC і Афінскі ўніверсітэт; Пітэр Шwіркман (Peter Schwirkmann), Дзяржаўны музей Берліна; Брында Зомер (Brinda Sommer), Дзяржаўны музей Берліна.

Апытальны ліст (Анкета) складаўся з двух частак. Частка "A" ідэнтыфікавала рэспандэнта (імя, установа, сяброўства ў CAMOC, дата заснавання музея і яго апошняя рэнавацыя, кароткае апісанне музейнай установы і яе прававы статус). Хоць анкеты не былі адрасаваны толькі тым, у каго праца мае прамое дачыненне да музея, большасць рэспандэнтаў належалі да гэтай катэгорыі.

Частка "B" складалася з 16 пытанняў, якія мелі мэты: 1. Сфармуляваць вызначэнне музея горада ў XXI стагоддзі. 2. Вызначыць тыпалогію музеяў гарадоў і выявіць установы, якія звязаны з гісторыяй горада, вылучыць спецыфічныя атрыбуты музеяў гарадоў. 3. Вызначыць профіль, калекцыі, прастору і канцэпцыю інтэрпрэтацыі ў музеі горада. 4. Вызначыць ступень удзелу музея ў культурным жыцці горада, сетку яго камунікацый, а таксама ўдзел гараджан у жыцці музея. 5. Выявіць інавацыйныя праекты, якія дэманструюць уплыў музея на горад. 6. Выявіць асноўныя праблемы і напрамкі будучага развіцця музея.

Такім чынам было сабрана 24 запоўненыя анкеты з 16 краін свету і 4 кантынентаў: чатыры з Кітая, тры з Германіі, два з Італіі, Бельгіі, ЗША, і па адным з Іспаніі, Партугаліі, Ірландыі, Нідэрландаў, Швецыі, Аўстрыі, Босніі і Герцагавіны, Турцыі, Расіі, Камеруна і Бразіліі. Звыш таго, быў таксама атрыманы апытальны ліст з Вялікабрытаніі на некаторыя ключавыя пытанні.

Дадзеныя апытання публікаваліся ў часопісе "CAMOC news" [7; 8], што дазваляе правесці іх аналіз.

**Ключавыя словы для "музея горада" па выніках апытання і матэрыялаў міжнародных воркшопаў у Берліне і Маскве.** Па выніках апытання сфарміраваны вялікі спіс ключавых слоў, якія апісваюць



Рэпазіторый БДУ

функцыянаванне сучасных музеяў гарадоў па групах: гарадская прастора і час, музейны кантэнт, музейная дзейнасць, грамадская з’ява, эканоміка, эмоцыі, музей і грамадства. Большасць з ключавых словаў акцэнтавана на сацыяльнай функцыі музея, часцей сустракаліся: ідэнтычнасць, разнастайнасць, удзел, гісторыя, памяць.

Можна вылучыць наступныя катэгорыі ключавых словаў, найбольш часта паўтаральных у розных рэспандэнтаў. У групе “Гарадская прастора і час”: урбаністыка, урбанізм, развіццё горада, будучыня, рэвіталізацыя, рэгенерацыя; гарадское дэмакратычнае планаванне; лічбавы горад; прастора, тэрыторыя; гарадская тканіна; радзіма; палімпсест. У групе “Музейны кантэнт”: дэманстрацыя кантэнту, забавы, вольны час, выставы, новыя тэхналогіі сторытэлінга. У групе “Музейная дзейнасць”: праграмаванне, атракцыя. У групе “Эканоміка”: сэрвіс-агенцтва для сусветнага турызму, прафесіі. У групе “Грамадскія з’явы”: гісторыя, асоба, памяць, змены, міграцыя, напрамкі развіцця, веды, гарадскі вопыт. У групе “Эмоцыі”: камфорт. У групе “Музей і грамадства”: музей – люстэрка гарадской разнастайнасці, сацыяльная актыўнасць, спосабы ўдзелу, месца сустрэчы, форум, ідэнтычнасць, радзіма, дыялог, дынаміка, інавацыі, гнуткасць, адкрытасць, правы чалавека, краўдсордзінг, паліфанія, гарадскія вароты, новы сторытэлінг, кампетэнтнасць, музейная самарэфлексіўнасць.

**Сучасныя фармуліроўкі паняцця “музей горада”.** У выніку воркшопа было складзена шэсць розных вызначэнняў музея горада з шасці краін і чатырох кантынентаў.

Так, Ян Гершоў (Jan Gerchow) з Франкфурцкага гістарычнага музея дае такое вызначэнне: “Музей горада – гэта цэнтр інфармацыі, адлюстравання і дыскусій пра горад, які прапануе шматгранныя трактоўкі мінулага як арыенцір, выступае форумам для важных тэм гарадскога грамадства і прыўносіць свой уклад у разуменне сучаснасці і будучыні гэтага грамадства. З дапамогай сваіх калекцый, экспазіцый і мерапрыемстваў музей рэагуе на сучаснасць і ставіць пытанні пра будучыню. Гарадскі музей спрабуе прадстаўляць і ўзаемадзейнічаць з гарадскімі супольнасцямі: як праз сваіх супрацоўнікаў, так і праз свае калекцыі. Музей арыентуецца на наведвальнікаў – іх вопыт і веды”.

Джоана Мантэйра (Joana Monteiro), Музей Лісабона, Партугалія: “Гарадскі музей павінен выступаць цэнтрам гарадской спадчыны, які прадстаўляе і тлумачыць гісторыю горада і яго ідэнтычнасць, спрыяючы тым самым інтэрпрэтацыі мінулага і сучаснасці горада. Гарадскі музей павінен умець расказаць гісторыю пра сваіх гараджан і гарадскія прасторы, улічваючы культурную, сацыяльную і эканамічную разнастайнасць горада. Акрамя таго, музей павінен дэманстраваць накіраванасць горада ў будучыню”.

Крысціян Нана Чуісеў (Christian Nana Tchuisseu), Камерун: “Гарадскі музей – гэта прастора, дзе людзі могуць ідэнтыфікаваць сябе, знаёміцца з дзейнасцю і праграмамі, распрацаванымі гэтай установай; а таксама гэта месца забаў для сям’і”.

Джулія Бусінгер (Julia Bussinger), Эль-Паса, Тэхаскі гістарычны музей, ЗША: “Гарадскі музей – гарадская прастора для гараджан і турыстаў, прызначаная для даследавання, атрымання новага досведу і забавы”.

Марыя Ігнез Мантавана Франка (Maria Ignez Mantovani Franco), ICOM Бразілія): “Гарадскі музей – гэта прастора форуму ведаў пра горад, дзе яго жыхары могуць разважаць пра мінулае, ідэнтыфікаваць сябе ў сучаснасці і сумесна фармуляваць будучыню горада. Гэта сучасны гістарычны музей, які ў якасці аб’ектаў вывучэння разглядае гарадскую тэрыторыю і гарадское жыццё ў розныя гістарычныя перыяды”.

Чэнь Цзяньчжун (Chen Jianzhong), Кітай: “Гарадскі музей – гэта грамадская культурная інфраструктура і культурная славутасць горада. Ён фарміруе пачуццё духоўнай радзімы ў сваіх гараджан, грунтуючыся на іх успамінах і чаканнях праз калекцыі і экспанаты” [7].

Аналізуючы прыведзеныя вышэй вызначэнні можна адзначыць, што ўсе яны разглядаюць музей горада як пэўную культурную прастору, якая арыентавана ў першую чаргу на задавальненне патрэбы ў самаідэнтыфакацыі жыхароў горада. Акрамя таго, назіраецца ўвага даследчыкаў да пашырэння функцыі музея горада з вывучэння мінулага да пазнання сучаснасці і накіраванасці ў будучыню праз інтэрпрэтацыю гарадской гісторыі ў музейнай прасторы.

**Тыпалогія і профіль музеяў гарадоў.** Наступная частка анкеты датычылася тыпалогіі музеяў гарадоў. Прапаноўвалася вылучыць установы найбольш блізкія да музея горада. У выніку апытання былі названы гарадскія архівы, гарадскія бібліятэкі, гістарычныя музеі, музеі гарадскіх грамадскіх аб’яднанняў, музеі навукі і тэхнікі, мастацкія галерэі.

Наступнае пытанне датычылася толькі супрацоўнікаў гарадскіх музеяў. Трэба было адзначыць, з якім вызначэннем неабходна

Рэпазіторый БДПУ

асацыіраваць гарадскі музей. Найбольш папулярныя адказы: грамадскі музей і грамадскі цэнтр, установа культуры, мастацкі музей, музей гісторыі, краязнаўчы музей, аб'ект спадчыны. У дачыненні да дадзенай часткі апытання Рэнэ Кісцемэйкер (Renée Kistemaker), старшы кансультант па праекце "Распрацоўкі і даследаванні ў Амстэрдамскім музеі", сакратар еўрапейскай сеткі "Музеі і гарадскія даследаванні" адзначае, што "гарадскі музей з'яўляецца шматпрофільнай установай: мае (ці можа мець) характарыстыкі музея гісторыі, мастацкага музея, краязнаўчага музея, музея супольнасці, археалагічнага музея, прамысловага музея. Гарадскі музей не існуе! Усё залежыць ад гісторыі музея і яго калекцыі, гісторыі горада і памеру горада" [7].

Трэцяя частка апытальніка накіравана на вызначэнне профілю музея з пункту гледжання займаемай прасторы, калекцый і інтэрпрэтацыі аб'екта даследавання. Вынікі паказалі, што большасць музеяў успрымаюць сябе як гарадскі альбо нацыянальны інстытут, а ў некаторых выпадках з пашырэннем межаў да ўзроўню не проста мясцовай установы, а ўстановы міжнароднага профілю.

У складзе калекцый музеяў гарадоў паранейшаму пераважаюць гістарычныя. Але яны ўжо сфарміраваныя, а ў цяперашні час назіраецца тэндэнцыя зрушэння ў бок калекцыянавання маштабных макетаў горада, новых медыя, фотаздымкаў, вусных гісторый. Калекцыі музеяў гарадоў адрозніваюцца таксама ў залежнасці ад геаграфічнага становішча і прыродных асаблівасцей тэрыторыі. Так, для еўрапейскіх музеяў тыповы склад калекцый – гэта карціны, гравюры, малюнкі, мэбля, археалогія, фатаграфія, нумізматыка, фалерыстыка, тэхніка. Тады як у афрыканскім музеі – гэта традыцыйны тэкстыль, упрыгажэнні, музычныя інструменты, нематэрыяльная спадчына – гульні, песні. У Кітаі вялікія калекцыі керамікі і каліграфіі.

Што тычыцца праблем інтэрпрэтацыі ў гарадскіх музеях, то большасць з іх спалучаюць гістарычны, мастацкі і дызайн-арыентаваны падыходы. Інтэрпрэтацыйны падыход таксама вызначаецца мэтамі і задачамі экспазіцыі, а міждысцыплінарнасць і разнастайнасць выступаюць як новыя рашэнні для сучаснай выстаўкі. У музейных экспазіцыях па-ранейшаму пераважаюць гістарычныя. Аднак назіраецца імкненне да дэманстрацыі сувязі мінулага і сучаснасці з магчымасцю прагназавання будучага стану горада.

**Музей горада ў сучаснай урбаністычнай прасторы і інавацыйныя праекты.** Аналізуючы чацвёртую частку анкеты, якая датычылася ацэнкі прысутнасці музея ў культурным жыцці горада, можна зрабіць наступныя высновы. Сучасныя музеі сапраўды могуць выконваць важную ролю ў грамадскім жыцці. Напрыклад, Музей Амстэрдама прадстаўлены ў Савеце Амстэрдамскага кансультатыўнага органа грамадскіх і прыватных музеяў. Музей таксама актыўна супрацоўнічае з архівам, археалагічнай службай і ўніверсітэтам. Музей Граца супрацоўнічае з універсітэтам, мясцовым фестывалем, рознымі асацыяцыямі ў галіне культуры і адукацыі.

Сярод прадстаўленых інавацыйных праектаў былі абноўлены Музей Франкфурта, выстава аб міграцыі ў Музеі Гента, выкарыстанне аўдыёвізуальных тэхналогій у музеі Валенсіі, праца школы для гарадскіх гідаў у Музеі Масквы, дызайн інтэрактыўнай прасторы для дзяцей да 10 гадоў у Музеі Масквы, праект "Сцяна" ў музеі Капенгагена, выкарыстанне інавацыйных тэкставых і інфармацыйных сістэм і стварэнне даступных онлайн-калекцый у музеі Амстэрдама, гарадскія экспедыцыі ў музеі Сан-Паўло, агульная мадэрнізацыя місіі і стратэгіі працы ў Музеі Лісабона. Сярод асноўных праблем былі названыя фінансавая нестабільнасць, сацыяльная значнасць, фарміраванне аўдыторыі і ўплыў мясцовай палітыкі. Былі пазначаныя наступныя прыярытэты развіцця: рост актыўнасці музея, развіццё музейнай сеткі і супрацоўніцтва паміж гарадамі, адлюстраванне ў музеі гарадской разнастайнасці і стварэнне ўмоў для дыялогу – фарміраванне грамадскай прасторы, арыентацыя на дэмакратыю і сацыяльную справядлівасць.

**Прычыны адсутнасці вызначэння паняцця "музей горада".** Даследчыкі пакуль не прыйшлі да адзінства ў вызначэнні дэфініцыі "музей горада". Гэта можа быць звязана з шэрагам прычын гістарычнага і культуралагічнага характару.

Размытая розніца паміж музеем горада і гарадскімі музеямі заключаецца ў тым, што музеем горада можна назваць практычна кожны музей у горадзе, які знаходзіцца ў падпарадкаванні муніцыпалітэта, прысвечаны гарадскім жыхарам, даследуе розныя аспекты гарадской гісторыі. Напрыклад, у Італіі англійскі тэрмін "city museum" выкарыстоўваецца ў дачыненні да муніцыпальных музеяў, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні муніцыпалітэта. Такія музеі складаюць амаль палову ад усіх італьянскіх музеяў і з'яўляюцца комплекснымі, тэматычнымі і вельмі разнастайнымі ўстановамі. Яны ўключаюць калекцыі

Рэпазіторый БДУ

жывапісу, археалогіі, дакументаў. Варта адзначыць, што італьянскія музеі не з'яўляюцца членамі CAMOC. Такія муніцыпальныя музеі вельмі моцна звязаны з мясцовай гісторыяй і ідэнтычнасцю, і з'яўляюцца часткай культурнай сеткі горада разам з бібліятэкамі, школамі, з якімі актыўна супрацоўнічаюць. Іх сувязь з мясцовай гісторыяй вызначае іх развіццё. Часта калекцыі іх заснаваныя на дарах жыхароў рэгіёна або рэлігійнай абшчыны (ордэна). Гэтыя музеі пачалі ствараюцца ў XVIII ст., аднак іх росквіт прыйшоўся на XIX ст., калі былі прынятыя законы ў 1866 і 1867 гг. аб передачы муніцыпалітэтам вялікіх калекцый рэлігійных ордэнаў. Яны сталі асновай гарадскіх музеяў і падкрэслівалі іх ідэнтычнасць ва ўмовах фарміравання нацыянальнай дзяржавы. Часам у горадзе можа быць адразу некалькі музеяў такога тыпу, кожны з іх захоўвае сваю частку гісторыі. Так у Мілане ёсць 15 муніцыпальных музеяў і не аднаго музея горада [9].

З іншага боку музеі гарадоў выходзяць за рамкі стандартных музейных катэгорый. Іх часта адносяць да гістарычных. Але ў выпадку з новымі і абноўленымі музеямі гарадоў гэта не адпавядае праўдзе, бо яны вельмі часта арыентаваны не столькі на мінулае горада, колькі на яго сучаснасць і будучыню. Місія і мэты такіх музеяў грунтуюцца не на іх традыцыйнай ролі, а на ўцягванні ў соцыум сучаснага горада і яго супольнасцяў.

Вызначыць катэгорыю музея горада таксама не проста, зыходзячы з яго калекцый, так як яны могуць быць вельмі разнастайнымі. Яны не абавязкова ўключаюць толькі прадметы, якія адносяцца да гарадской ідэнтычнасці і гісторыі, але таксама і прадметы, якія маюць дачыненне да сучаснасці ў рамках сацыяпалітычнага кантэксту часу яны ўключаюць – археалагічныя знаходкі, фатаграфіі, творы мастацтва, адзенне, мэблю, аб'екты матэрыяльнай культуры, прыватныя калекцыі і памятныя рэчы, а таксама зусім новы напрамак калекцыянавання – лічбавыя носьбіты інфармацыі (кантэнт), сучасныя творы мастацтва, аўдыё- і відэадакументы і іншае.

Таксама ў аснове вызначэння не можа ляжаць форма ўласнасці – нацыянальны, муніцыпальны або прыватны музей. Напрыклад Музей Ліверпуля, адкрыты ў 2011 г., мае статус нацыянальнага, Музей Балонні, адкрыты ў 2011 г. – прыватны музей, які кіруецца банкам, Музей Капенгагена заснаваны муніцыпалітэтам. А ў Італіі, як ужо было сказана вышэй, большасць музеяў муніцыпальныя, але вельмі мала музеяў гарадоў.

Яшчэ адна з прычын адсутнасці вызначэння паняцця "музей горада" ў тым, што яны перажываюць этап трансфармацыі. Нельга сказаць, што адсутнасць вызначэння музея горада выклікана неразуменнем яго сутнасці сярод спецыялістаў. Усе музеі нашага часу падвержаны радыкальным зменам пад уплывам важных сацыяльных падзей. Наша эпоха характарызуецца ўзрастаючымі міграцыйнымі патокамі, паскоранай мабільнасцю, флюктуацыяй інфармацыі, культуры, ідэй і рэчаў, фарміравання жыцця пад уплываем інтэрнэту і мас-медыя, развіцця касмічных тэхналогій і транспарту. За апошнія 20 гадоў традыцыйнае разуменне музея і яго сацыяльнай функцыі таксама радыкальна змянілася. Вядзецца пошук новага вызначэння на базе Міжнароднага савета музеяў (ICOM). Музей сёння ўспрымаецца не толькі як захавальнік каштоўнасцей, але і як удзельнік грамадскіх працэсаў, з нарастаючай адукацыйнай, палітычнай і сацыяльнай роляй. Музей ужо не ўспрымаецца як люстэрка грамадства, а як яго паўнапраўны агент, які можа стаць пляцоўкай для дыялогу ў вырашэнні грамадскіх рознагалоссяў.

Магчыма, музеі гарадоў не маюць свайго выразнага вызначэння як раз па прычыне таго, што яны найбольш уцягнутыя ў сацыяльныя змены, зыходзячы з свайго паходжання і развіцця, сваіх асаблівых характарыстык і свайго галоўнага аб'екта – горада. Ва ўмовах глабалізацыі ў свеце і ў Еўропе ў прыватнасці змяняецца і роля горада. Фарміраванне Еўрапейскага саюза шмат у чым аслабляе нацыянальныя дзяржавы, а гарады пачынаюць, з аднаго боку, выконваць ролю сувязнога звяна паміж краінамі, а з другога – спаборнічаць паміж сабой за захаванне большай долі рынку, прыцягненне інвестыцый, турыстаў і міжнародных падзей. Таксама для еўрапейскіх гарадоў вялікім выклікам з'яўляюцца мігранты. Па дадзеных Еўрастата ў 2010 г. іх колькасць у Еўропе складала 47,3 мільёнаў і пражываюць яны ў асноўным у гарадах. У гэтых умовах музей гісторыі горада заклікаhistoны захоўваць і прадстаўляць гарадскую гісторыю, фіксаваць дадзеныя працэсы, а таксама спрабаваць уключыцца ў іх як сацыяльны інстытут. Шматлікія музеі актыўна эксперыментуюць у гэтым напрамку.

**Заключэнне.** Такім чынам, пошукі вызначэння паняцця "музей горада" працягваюцца. Цікавасць да дадзенай групы музеяў узрастае на міжнародным узроўні. Аналіз матэрыялаў навуковых канферэнцый CAMOC і дадзеных воркшопаў у Маскве і Берліне дазваляе зрабіць наступныя высновы.

Рэпазіторый ВДУ

У аснове калекцый гарадскіх музеяў могуць быць самыя разнастайныя прадметы як матэрыяльнай, так і нематэрыяльнай культуры (вусная творчасць, успаміны), на аснове якіх можна ствараць прастору для зносін. Музеі павінны імкнуцца адлюстроўваць гісторыю ўсіх удзельнікаў гарадскога грамадства. Музею неабходна ўзаемадзейнічаць з гарадскімі супольнасцямі для стварэння сумесных праектаў і развіцця краўдсорсінга. Музей здольны выступаць пасрэднікам паміж гараджанамі і гарадскімі ўладамі.

У пытанні прысутнасці ў гарадской прасторы музей адыгрывае важную ролю праз стварэнне гістарычных экспазіцый, асветы і ўплыву на гарадское планаванне, а таксама можа мяняць гарадскую прастору праз стварэнне новых экспазіцый, прыцягненне турыстычных патокаў і развіццё гандлю. Музейныя калекцыі павінны быць даступнымі як фізічна, так і віртуальна, што магчыма ў лічбавую эпоху. З пункту гледжання прасторы музей можа займаць яе і фізічна і на лічбавых платформах. Прысутнасць гарадскіх музеяў у лічбавай культуры вельмі вялікая (вэб-сайты, сацыяльныя сеткі, мабільныя прылажэнні), што спрыяе пашырэнню аўдыторыі. Музеі развіваюць супрацоўніцтва з іншымі інстытуцыямі з мэтай пашырэння сваёй прысутнасці ў горадзе і выкарыстання грамадскай прасторы.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Our Greatest Artefact: the City. Essays on cities and museums about them [Electronic resource] – 2012. – Mode of access: http://network.icom.museum/fileadmin/user_upload/minisites/camoc/PDF/CAMOCBookOurGreatestArtefactTheCity.pdf – Date of access: 27.10.2019.
2. Музей города. К Октябрю 1927: Очерк музея и путеводитель. – Ленинград: Музей города, тип. 1-й Ленингр. артели печатников, 1927. – 17 с.
3. Джонсон, Н. Открывая город / Н. Джонсон // Международный журнал «Museum» (ЮНЕСКО). – 1996. – № 187. – С. 4–6.
4. Хебдич, М. Музеи о городах / М. Хебдич // Международный журнал «Museum» (ЮНЕСКО). – 1996. – № 187. – С. 7–11.
5. Галла, А. Городская музеология: идеология примирения / А. Галла // Международный журнал «Museum» (ЮНЕСКО). – 1996. – № 187. – С. 40–45.
6. City museums as centres of civic dialogue, Amsterdam Historical Museum. Amsterdam [Electronic resource] – 2006. – Mode of access: https://hart.amsterdam/image/2017/5/17/2005_city_museums_as_centres_of_civic_dialogue.pdf – Date of access: 27.10.2019.
7. Mouliou, M. Defining Museums of Cities in the 21st Century. Work in progress [Electronic resource] / M. Mouliou // CAMOC news. – 2015. – № 3. – Mode of access:http://network.icom.museum/fileadmin/user_upload/minisites/camoc/PDF/Newsletters/CAMOCNewsletter2015_3_Corrected8.15.2015.pdf. – Date of access: 09.02.2020.
8. Mouliou, M. Moscow Workshop: «Redefining the city museum in the 21st century» [Electronic resource] / M. Mouliou // CAMOC news. – 2015. – № 4. – Mode of access:http://network.icom.museum/fileadmin/user_upload/minisites/camoc/PDF/Newsletters/CAMOCNewsletter2015_4.pdf. – Date of access: 09.02.2020.
9. Lanz, F. City museums: reflections on a missing definition [Electronic resource] / F. Lanz // CAMOC news. – 2019. – № 2. – Mode of access: http://network.icom.museum/fileadmin/user_upload/minisites/camoc/CAMOCReview_No._2_2019_September_Web_r_ISBN.pdf. – Date of access: 09.02.2020.


*Паступіў у рэдакцыю 13.04.2020*

Репозиторий БГУКИ